**А.М.Пісарэнка,** *кандыдат філалагічных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў*

# ВОБРАЗНАЕ СЛОВА МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ ЯК СРОДАК ВЫХАВАННЯ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выхаванне студэнцкай моладзі сродкамі выкладаемых дысцыплін заўсёды шматпланавае, шматаспектнае. Так, напрыклад, пры вывучэнні мастацкай літаратуры, яе мовы мы не толькі ўплываем на фарміраванне светапогляду асобы, на яе адчуванне і стаўленне да жыцця, да аб̓ектыўнай рэчаіснасці, да такіх маральных каштоўнасцей, як Радзіма, маці, мова, дабро, каханне і інш. Адначасова фарміруюцца моўны густ, моўная культура студэнтаў, паколькі менавіта мова мастацкай літаратуры выконвае ў большай ступені функцыю эстэтычную, а затым ужо – намінатыўную. Сутнасць першай – у маляўнічым адлюстраванні свету, у тым, што праз мастацкія вобразы адбываецца ўздзеянне на думкі і пачуцці асобы, і яна [асоба] павінна атрымаць эстэтычнае задавальненне ад прачытання мастацкага тэксту.

Вобразныя сродкі, якіх часам бракуе мове сучаснай літаратуры, якраз і выконваюць ахарактарызаваную функцыю; асабліва прадуктыўна выкарыстоўваецца такая іх разнавіднасць, як тропы (эпітэт; метафара і яе разнавіднасці – метанімія, сінекдаха; параўнанне; перыфраза; увасабленне).

Эпітэт як вобразны сродак дэталізуе малюнкі, называе вызначальныя для раскрыцця ідэйна-эмацыянальнага зместу твораў рысы прадмета, паняцця, выяўляе аўтарскую ацэнку апісаных падзей і інш. Пры правядзенні лінгвістычнага эксперыменту (калі можна апусціць названы троп) мастацкі радок губляе дакладнасць, відочнасць, што, безумоўна, зніжае і яго экспрэсіўнасць. Эпітэт актыўна ўжываецца пры апісанні прыроды, краявідаў нашай непаўторнай Бацькаўшчыны: Надарылася і навальніца, з *бурным, імклівым* дажджом, *доўгім старэчым* кашлем грому і *белымі* пісягамі маланак ва *ўспененых* хмарах… (Б.Сачанка); Узлескі і паляны патанаюць у *белых* карунках *легкакрылых* рамонкаў і амежніку…(Р.Ігнаценка); Лістотаю *залатою*/ Верасень выслаў ганак./ Антонаўкай,/ Сырадоем,/ Бульбаю *маладою*/ Пахне *крамяны* ранак (А.Пісьмянкоў); Пашапчыце, /Грыбныя дажджы,/

Паспявайце,/ Завейныя зімы! (А.Пісьмянкоў); Рассыпаюць хмары з сініх хустак/ Дажджоў сцюдзёную жарству (М.Танк); Набрынялыя пупышкі,/ Раскалоўшыся ад грому,/ Прыбіраюць цветам пышным/ Кожнай яблыні карону (Н.Гілевіч).

Менавіта з дапамогай эпітэта, як дакладнага, так і вобразнага, пісьменнікі выяўляюць сваё захапленне роднай мовай, адданасць ёй. Мова – духоўная спадчына, што павінна быць перададзена іншым пакаленням; і як адзін са спосабаў яе захавання – мова мастацкай літаратуры, якая разам з тым і выхоўвае любоў і павагу да слова беларускага: У нас сваіх хапае слоў/ *Крамяных, росных, васільковых/* Ад мурагоў і ад лясоў,/ Ад *светлых* высяў *жаўруковых* (Ю.Свірка); Свабодна і лёгка ліюцца ў душу/ *Мядовыя* пахі лугоў і дубровы… / З маленства пад сэрцам цябе я нашу,/ Зямлі маёй *сціплай гаючае* слова (С.Законнікаў); *Ільняная* і *жытнёвая. Сялянская. / Баравая ў казачнай* красе. / *Старажытная.* Ты *самая славянская. Светлая,* як травы ў расе. / *Вобразная, вольная, пявучая,* / Мова *беларуская* мая (П.Панчанка); Спачувальна не глядзіце / Ў твар *любімай* мовы./ Пашукайце і знайдзіце/ *Сонечныя* словы (У.Скарынкін).

Яшчэ адным сродкам апісання менавіта хараства роднай прыроды, яе непаўторнасці і велічнасці з'яўляецца метафара. Гэты стылістычны прыём праз мастацка-вобразнае слова нібы "ажыўляе" навакольны свет, дае нам адчуванне, што ўсё: і кветкі, і рэкі/ азёры, і вятры, і сонца і інш. – жывое, мае сваю душу; усё вакол нас жыве і адчувае, як чалавек, і патрабуе да сябе адпаведнага стаўлення: беражліва-ашчаднага, нераўнадушна-трапяткога. Толькі з такімі пачуццямі маладое пакаленне зможа памнажаць шчасце сваёй Радзімы: Вечарэе. *Дзень даўно павесіў*/ На сасне сваю *касу зары; Зара нацягнула свой лук,*/ Каб сонца *паслаць у свет*; У беларускую восень/ Нат і *верабей багацее,*/ *Лес на грыбы не скупіцца,*/ *Пуні хмялеюць ад сена,*/ *Мёдам вуллі набракаюць,*/ *Сцежкі гараць ад лістоты,*/ *Скрыпкі грымяць на вяселлях,*/ І маладзіцы дабрэюць у беларускую восень (М.Танк). Відавочнае аўтарскае захапленне родным краем увасабляецца ў шматлікіх метафарычных вобразах. Лічым важным і неабходным праводзіць як моваазнаўчыя, так і літаратуразнаўчыя разборы менавіта на такіх ці аналагічных прыкладах. Аднак розныя віды мовазнаўчага аналізу (фанетычнага, графічнага, арфаграфічнага, марфалагічнага і інш.) варта пачынаць са слоў без пераносна-вобразнага ўжывання. У такім выпадку студэнту прасцей акрэсліць змест лексемы, яе граматычныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

катэгорыі і сінтаксічную функцыю. Безумоўна, у беларускай літаратуры ёсць вялікая колькасць празаічных тэкстаў, дзе ўжыванне слова (у параўнанні з паэтычнымі і драматургічнымі тэкстамі) пазбаўлена ўмоўнасці, гутарковасці. Такія тэксты выконваюць адначасова і пазнавальную, і выхаваўчую ролю. Звернемся, напрыклад, да ўрыўкаў з кнігі Я.Сіпакова “Зялёны лісток на планеце Зямля”: “Май умайвае нашу зямлю. Гэта месяц травы. Нездарма ж яшчэ ў старажытнасці звалі яго траўнем!”; “Чэрвень – самы светлы, самы спякотны, самы звонкі ад салаўінага пошчаку месяц. І чырвоны, бо чэрвень гэта – ад пладоў і ягад, якія пачынаюць спець. У чэрвені ўсё пасеянае і непасеянае пачынае імкліва расці і набірацца сіл. Цвітуць каліна, язмін, шыпшына, ядловец, белая акацыя, маліна, зацвітаюць чарніцы, буякі, журавіны, а на лугах – канюшына, ятрышнік, незабудкі, кмен, дзьмухавец…”; “Мы ж свой сёмы месяц завём ліпенем. Бо ў ім якраз цвіце на Беларусі ліпа. Яе цвіценне рухомае – і квет, і пах ідзе па нашай зямлі з поўдня на поўнач з хуткасцю каля 50 кіламетраў у суткі”. Відавочна, што праз змест прыведзенага і аналагічных тэкстаў яскрава бачыцца як багацце беларускай мовы, так і хараство беларускай зямлі. А назвы месяцаў і назвы раслін у Беларусі матываваныя, мілагучныя, вартыя лінгвістычнай ацэнкі.

Актыўна насычаюць вобразнасцю і экспрэсіяй мову мастацкага тэксту параўнанні. Маючы двухкампанентную структуру (аб̓ект і прадмет супастаўлення), названы троп лёгка вылучаецца з кантэксту, дэманструе незвычайнасць аўтарскага светаўспрымання і, безумоўна, не пакідае раўнадушным чытача/ слухача: Шчодра цвіў гэтай вясной сад. Спачатку вішні і грушы, потым яблыні. Была пара, калі ўсе *дрэвы стаялі, як белыя, ружаватыя воблакі* (І.Мележ); *Словы матчынай мовы,*/ *Роем руплівым* кружыце,/ На вуснах водар мядовы/ Ліпы, красак і ружы (У.Карызна); Па *яблыку выспелі зоры*/ І *падаюць з неба, як з дрэў* (А.Пісьмянкоў); Разгарну буквар вясёлы – / Зноў [*мова. – А.П.*] са мной гаворыш ты,/ *Мілагучная заўсёды,*/ *Як званочак залаты*! (Н.Гілевіч).

Тэматычна і філалагічна правільна падабраны фактычны матэрыял на розных тыпах заняткаў пры рознай метадычнай іх арганізацыі дазваляе завастрыць увагу асобы і на цікавых лінгвістычных фактах, і на іх сэнсавай напоўненасці. Так, напрыклад, аўтарская перыфраза, якая вельмі часта як апісальны выраз без адпаведнага кантэксту можа быць незразумелай, актыўна адлюстроўвае незвычайнасць мастацкага светаўспрымання аўтараў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актывізуе вобразнае мысленне студэнцкай моладзі і наглядна дэманструе ўзорныя адносіны да духоўных каштоўнасцей: *Беларусь, мая сонца-краіна; Маёй сілы крыніца / Родны край Беларусі*; О, *Беларусь! Мой лёс! Мой першы боль,/ Мая нявыспеваная давеку/ Песня!*; І роднай матусяй/ Да скону мне стала – / *Зямля Беларусі, Краіна Купалы; Зямля Беларусі, старонка мая./ Сыноўняга сэрца надзея; Слова! Цуд найвялікшы між цудаў-дзівосаў,*/ Што здзіўляў у вяках і здзіўляе нанова./ Трапяткое,/ жывое,/ як сонца у росах,/ *Несмяротнае, роднае матчына слова* (Н.Гілевіч). Варта адзначыць, што са студэнтамі філалагічных спецыяльнасцей прыклады, падобныя прыведзеным, трэба аналізаваць больш падрабязна (напрыклад, пры вывучэнні тэм "Мастацкі стыль", "Выразнасць маўлення", "Багацце маўлення", "Зваротак" і інш.). Гэта тлумачыцца тым, што вобразныя сродкі ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, удакладняюць семантыку адзін аднаго, канкрэтызуюць вобразы. Усе ўзгаданыя вышэй перыфразы маюць у сваёй структуры эпітэты, без якіх мастацкі радок згубіў бы сваю экспрэсіўнасць: *нявыспеваная давеку* песня; *найвялікшы* цуд між цудаў-дзівосаў; *несмяротнае, роднае* матчына слова і інш.

Мастацкая літаратура і яе мова пры вывучэнні ў сістэме ВНУ павінны (акрамя іншых аспектаў) вучыць самастойнаму мысленню, уменню цікава і разнастайна, правільна і дакладна выкладаць думкі. У гэтым плане вялікую падтрымку выкладчыку і студэнту можа аказаць афарыстыка мастацкіх тэкстаў. Вядома, што афарызмы – гэта трапныя лаканічныя выслоўі, якія могуць ужывацца без кантэксту; такія выразы маюць багаты падтэкст, выяўляюць духоўнае хараство чалавека і тым самым выконваюць эстэтычную і выхаваўчую функцыі. Сучаснае маладое пакаленне ўсё больш звяртаецца да крылатых выразаў замежных аўтараў для падмацавання ўласных думак. Аднак беларуская літаратура мае таксама шматлікую колькасць выразаў, вартых цытавання, вартых пашырэння сферы (са сферы мастацкай літаратуры ў публіцыстыку, у сферу сацыяльна-бытавых зносін). Тым больш, што беларускія афарызмы таксама тэматычна разнастайныя, эстэтычна-вартасныя: *Жыву, не трацячы надзей,/ Бо веру ў дабро людзей* (С.Грахоўскі); *Калі ўсе згублены ключы,/ Калі ні шанцу,/ анічога – / усё ж ідзі,/ любі,/ крычы/ і пасягай на перамогу* (А.Разанаў); *О, боязь за другога чалавека!../ Адна ты робіш чалавека з нас* (Н.Мацяш); *Рана-рана сталеюць унукі,/ Калі паміраюць дзяды; Да тлустае лусты/ Даў лёс ім дажыць,/ І скрозь у іх – густа,/ Ды пуста ў душы* (А.Пісь-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мянкоў); *Гарбаты свет – / Калі ты сам гарбаты; Пагаслая зорка – / Не зорка; А ў плечы ўцягнеш галаву – / Не зносіш галавы* (У.Някляеў); *Не, не пройдзе любая памылка бясследна,/ Пустацвет не саспеліць крамяных пладоў* (С.Законнікаў); *Тых, хто носіць небасхіл у сэрцы,/ Нельга ні ўджаліць, ні забіць* (У.Караткевіч); *Другіх не папракай і не вучы,/ А паспрабуй сябе перамагчы* (С.Грахоўскі); *Блізкай дзе няма душы, – Пустыня* (Н.Мацяш); *Без чалавечнасці не будзе вечнасці* (П.Панчанка). Гэты рад афарызмаў можна доўжыць, і кожны з выразаў не можа не захапляць: праз прамое ці пераноснае значэнне слоў аўтары дзеляцца ўласным вопытам, перасцерагаюць аб памылках, суцішаюць хваляванні або натхняюць на дасягненне мэт. Нездарма кажуць, што кніга – самы надзейны сябар. Святло мастацкага слова заўсёды ўзбагачае свет чалавека, упрыгожвае яго жыццё. Ёсць вечныя тэмы, ёсць адвечныя ісціны, якія лягчэй асэнсаваць і ўсвядоміць з дапамогай менавіта мастацкіх твораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ